**Апісанне ігрышча (абрадавай гульні) “Ката пячы”**

**па друкаваных крыніцах, экспедыцыйных матэрыялах і звестках,**

**запісаных ад жыхароў аг. Скірмантава Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці,**

**якое праводзіцца імі 27 лістапада на загавіны перад Піліпаўкай**

**Тлумачэнні тэрмінаў**

**Ігрышча** — збор моладзі для гульняў, танцаў і іншых забаў; вечарынка з пітвом, частаваннем (ТСБМ, т.2)

**Загавіны** – апошні дзень перад пастом, калі веруючым дазваляецца есці скаромнае (ТСБМ).

**Народныя гульні** — від актыўнага адпачынку чалавека, гістарычна сфарміраванага на аснове драматызаваных, умоўных і творчых дзеянняў, у якога склаліся пэўныя правілы і прыёмы забаў і які з’яўляецца сродкам фізічнага, разумовага і маральна-эстэтычнага выхавання. Многія народныя гульні ўзніклі з абрадаў і развіваліся са старажытных часоў і дагэтуль нясуць на сабе сляды язычніцкіх культаў, але ў бытаванні не ўспрымаюцца як сродак вераванняў, а як сродак адпачынку і набыцця карысных навыкаў. (Лозка А.Ю. “Гульні, забавы, ігрышчы” з серыі БНТ Акадэміі навук Беларусі, Мінск, 1996, стар.17).

**Звесткі пра ігрышча “Ката пячы” ў публікацыях**

**1)** Вядомаму рускаму і беларускаму этнографу і фалькларысту XIX стагоддзя Паўлу Васільевічу Шэйну інфарматары з розных рэгіёнаў Мінскай губерніі пісалі пра існаванне такога ігрышча ў розных рэгіёнах Міншчыны.

— Настаўніца Гатаўскага народнага вучылішча Алімпіяда Сонцава адзначала, што ў **Гатава Мінскага павета** яно праводзіцца толькі на калядныя святы.

“Збіраюцца хлопцы і дзяўчаты ў якую-небудзь хату і там рыхтуюць розныя закускі і галоўнае — рыхтуюць з цеста фігуру ката наступным чынам: галаву і тулава робяць з цеста, вушы і ногі з сала, а хвост з каўбасы. Спёкшы такім чынам гэтую фігуру, вешаюць сярод пакоя пад столлю. Затым кожны з удзельнікаў абраду па чарзе пад’язджае на ўхваце да “ката”, каб зубамі адкусіць у яго кавалачак, ці, калі атрымаецца, то і ўсяго яго адарваць. Пры гэтым яздок павінен гаварыць: “Еду з кута да “ката”, цап за “ката”. Але мала каму ўдаецца выканаць такую ролю з поспехам, таму што яго ўвесь час смешаць. Калі ж нехта засмяецца, то яму абавязкова вымажуць твар анучай, спецыяльна забруджанай у сажы, і не пусцяць ужо да канца. Але калі не рассмяецца, то таго дапускаюць паласавацца кавалачкам або нават поўнасцю сарваць “ката”. Такім чынам, гэтая забава працягваецца дагэтуль, пакуль хто-небудзь зусім не адарве “ката”. Тады “ката” ложаць на стол і дзеляць на ўсю кампанію. Па заканчэнні гульні ўсе сядаюць за стол, п’юць і закусваюць, затым танцуюць да ранку”:

— З Самахвалавіцкай воласці П.Г. Бывалькевіч запісаў гэты звычай у в. Рапабдзіўшчына. Па яго звестках, **у Слуцкім павеце** падчас аднаго з вечароў Раства Хрыстова яго праводзілі амаль паўсюдна.

(Лозка А.Ю.“Гульні, забавы, ігрышчы” з серыі БНТ Акадэміі навук Беларусі, Мінск, 1996, стар. 102 і 463).

— Вучань Мінскай семінарыі В.Р.Станкевіч паведаміў пра тое, што сялянка Марыя Іванаўна з **Вілейскага павета** расказвала яму, што абрадавая гульня праводзілася ў першы вечар асенніх пасядзелак ці супрадкаў: “Сабраўшыся для гэтай мэты ў выбранай хаце, дзяўчаты гэтым дзеяннем адкрываюць свой сезон. Яны рыхтуюць з пшанічнай мукі цеста, якому надаюць форму ката і пякуць яго на светачы ці коміне. І затым дзеляць яго паміж сабою. Пры гэтым спяваюцца нейкія песні, якіх апавядальніца гэтага абраду, сялянка Марыя Іванаўна, не ведала. Калі-нікалі гэтага “ката” кідаюць праз вакно якому-небудзь хлопцу, каб напалохаць яго і вызваць на вуліцу”(Лозка А. Ю., там жа, стар 200, 477).

**2)** Этнахарэолаг Мікола Аляксеевіч Козенка ў раздзеле “Народныя гульні” выдання “Традыцыйная мастацкая культура беларусаў”, Мінск, 2011, том 5, кніга 2, на стар.275-276 прыводзіць апісанне гэтага ігрышча ў вёсках Чыжаха Бярэзінскага і Гайна Лагойскага раёнаў:

“У ката” . Калядная гульня, найбольш пашырана ў Цэнтральна-Усходнім рэгёне Міншчыны (**Лагойскі, Барысаўскі, Бярэзінскі** і іншыя раёны). Мае варыянты. У в. Чыжаха Бярэзінскага раёна гуляла моладзь на багатую Каляду. У адну з хат, якую вызначылі для гуляння, хлопцы прыносяць гарэлку, дзяўчаты — закуску. Абавязковым атрыбутам вечарынкі з’яўляецца выпечаны з цеста кот. Яго падвешвалі да столі.

“Хлопец з парога садзіўся на вілошнік і ехаў да кута, дзе вісеў кот. Трэба было адкусіць у ката мудзі — гэта тое, што адрознівае ката ад кошкі. Хлопец, якому ўдавалася адкусіць мудзі, быў годны да жаніцьбы” (Марыя Мурач, 1936 г.н., в.Чыжаха, Бярэзінскі раён).

У в. Гайна Лагойскага раёна ката клалі на дошчачку такім чынам, “каб яйца спускаліся”. Таму, хто адкусіць яйцо, пляскалі ў ладкі і павязвалі з левага боку пояс. Затым ката разразалі і з’ядалі. Пасля застолля пачыналіся “гулі”.

На стар.327—328 гэтага ж выдання апісваецца, як “гулялі ката” на Міхайлу зімовага 21 лістапада ў в. Галавачы Клецкага раёна (запісана ад Марыі Масько 1933 года нараджэння). Ката падвешвалі да столі так, каб можна было падымаць вышэй і апускаць ніжэй. Арганізатары гульні вялі дыялог з гульцом: “Куды едзеш? — Да кута. А што рабіць? — Грызці “ката”. Грызі, калі ўдасца!”. Ехалі да ката на палцы, як на кані. Нельга было чапаць яго рукамі і смяяцца. У гэты святочны дзень не пралі, таму падлеткі збіраліся і гулялі ў ката.

На стар 73— 74 ў артыкуле пра калядныя вячоркі — запіс Вольгі Басько з Вілейскага раёна, в.Сосенкі ад Ніны Пуцята 1918 года нараджэння: “Гулі рабілі болей на Новы год. У нас у хаце “ката спраўлялі”, называўся “кот”. Наймалі музыканта, і во як свадзьба, сталоў стаўлялі і тады ўжэ гулялі дзень, другі дзень, танцавалі, песні за сталом. Гэта толька названне было “спраўляць ката”, а ката з мукі не выпякалі, так гулянка. Спраўлялі ката на Ражаство”. У в. Стайкі Вілейскага раёна Алена Мядзвецкая 1918 года нараджэння расказала, што і ў іх гулялі ката. А хто зваў “сарока”. Пілі трошкі, елі, гулялі, танцавалі і дзень, і два, і

тры, а нічога не пяклі. “Бедната была, хто там прынясе пірага ці каўбасу!” — тлумачыла інфарматарка.

**3)** Энцыклапедычны слоўнік “Міфалогія беларусаў”, Мінск, 2011 год, на стар. 249 у артыкуле “Кот” дае звесткі пра тое, што
“У сярэдзіне XX стагоддзя на Міншчыне і Вілейшчыне яшчэ была распаўсюджана абрадавая гульня пад назвай “пячы ката”, якую можна лічыць рэліктам колішняга ахвярапрынашэння Кату. Гульня палягала ў тым, што пяклі з цеста крэндзель ці каравай у выглядзе ката і падвешвалі яго да столі ў хаце. Кот раскачваўся пад столлю, а ўдзельнікі гульні лавілі яго. Потым Ката разразалі і дзялілі паміж сабою. Кожны з’ядаў сваю долю”.
У гэтым жа выданні на старонцы 283 ёсць артыкул пра Любмела — бога шлюбу, у гонар якога ў Мінскай і Віцебскай губернях ладзілі абрад падчас вяселля: апраналі хлопчыка 10-12 гадоў у белую кашулю з прыгожым поясам і ў чырвоныя боты або чаравікі, на галаву — вянок з чырвоных кветак або чырвоны завой. Ён увасабляў сабой Любмела і сустракаў маладых разам з бацькамі, даруючы ім медзяныя манеты ў хустачцы.
Аналагічныя артыкулы ёсць у гэтым жа энцыклапедычным слоўніку 2006 года выдання.

**4)** У інтэрнеце ўдалося адшукаць звесткі пра Люба і Нелюба са спасылкай на **“Словарь славянской мифологии» Глушко У.А и Медведева Ю.М.**
**5)** “Словарь славянской мифологии. Происхождение славянской мифологии и этноса» (автор Л.Т. Мирончиков, Минск, 2004) тлумачыць вобраз ката ў двух выпадках:

- на стар. 166 у артыкуле «Курочки и петушки» вобраз ката ў казках звычайна суправаджаецца вобразам лісы, якая крадзе пеўніка, а кот даганяе лісу і адбірае ў яе пеўніка. Але ён не ў сілах вярнуць пеўніка, калі яго ўжо пакармілі ў лісы. Пеўнікамі і курачкамі называлі моладзь, якую пасвячалі ў старажытных свяцілішчах. Звычайна пеўнік накіроўваўся ў род нявесты, дзе ён на працягу 3 або 5 гадоў праходзіў падрыхтоўку да шлюбу. Часта адбывалася скраданне як пеўнікаў, так і курачак.

  **Кот, які з'яўляўся прадстаўніком узроставай группы пасвячаемых**, звычайна адшукваў скрадзенага юнака і вяртаў у свяцілішча. Але калі яго ўжо пакармілі сакральнай ежай (здзейснілі яго пасвячэнне), Кот не меў права на тое, каб яго вярнуць.
- на стар. 34 у артыкуле «Бастет» (Баст) тлумачыцца, што гэта назва багіні ў старажытных егіпцян, якая ўяўлялася ў вобразе кошкі. А ў балгар калядоўшчыкаў у некаторых месцах называлі па-славянску - «каты», «кошкі».

**Звесткі пра ігрышча “Ката пячы” з экспедыцыйных матэрыялаў журналісткі і філолага Гамзовіч Рэгіны Станіславаўны (з 90-х гадоў XX стагоддзя па 2014 г.)**

Працуючы на беларускім радыё над перадачай “Спадчына”, запісвала ў 90-х гадах звесткі пра гэтую абрадавую гульню ў некалькіх вёсках на Міншчыне.

У Вілейскім раёне ў яе гулялі дзеўкі ў Пілiпаўскі пост. Хлопцы не прысутнічалі, але хто даведваўся, дзе гэта будзе адбывацца, стараўся падглядаць. Такога дзяўчаты маглі і пабіць. А пірог у выглядзе ката пяклі посны. Падвешвалі яго да столі і ад парога ехалі на вілках са словамі "Еду з кута да ката. Цап за ката!". Вілкі служылі шостам, на які можна было абаперціся і падскочыць. Хто змог злаўчыцца і адкусіць кусок — дзяліў пірог паміж усімі ўдзельніцамі. Гэтыя ж інфарматары казалі, што і хлопцы гуляюць у гэтую гульню, але асобна ад дзевак.

У вёсцы Гайна Лагойскага раёна быў зняты сюжэт для тэлеперадачы "Радавод" Беларускага тэлебачання з удзелам фальклорна-этнаграфічнага гурта "Суседкі" з Гайны і школьнікаў старэйшага ўзросту, якія добра перанялі ад удзельніц гурта мясцовыя народныя танцы. Перад гульнёй старэйшыя жанчыны выкруцілі спецыяльны пояс (кручаны, як вяроўка, з кістачкамі па канцах) — за яго заўсёды прывязвалі Ката да столі. А той, хто злаўчыўся адкусіць "мудзі" пад хвастом ката, атрымліваў гэты пояс разам з пірагом, які дзяліўся на ўсіх удзельнікаў.

У вёсцы Чыжаха Бярэзінскага раёна адна з жанчын і зараз лоўка пячэ ката цалкам з цеста (фота дадаецца). Там таксама трэба адкусіць мудзі пад хвастом у Ката.
Ката пяклі ў Новінах, Бычыне, Чыжасе і іншых вёсках гэтага раёна. УНовінах гэтая абрадавая гульня існуе дагэтуль, толькі прымяркоўваюць яе да праводзін Каляд.

У в. Новіны пяклі пірог у выглядзе ката, а хвост рабілі з каўбасы, вушы і ножкі з сала са скуркай. І спраўлялі падчас ігрышча на Каляды, часцей пасля Шчодрага вечара і да Вадохрышча. Маглі пагуляць з катом і падчас ігрышча, прысвечанага развітанню з Калядамі 21 студзеня, калі адбывалася пагулянка ў складчыну. Жанчыны прыносілі закуску і накрывалі на стол, а мужчыны, пакінуўшы гарэлку, ішлі цягнуць Каляду на дуба (на саначках везлі снапок з жыта, які на Каляды стаяў у Чырвоным куце, і ўсцягвалі яго разам з драўляным колам і гаршком з куццёй на дуб, які адзінока стаяў у полі). Леташні снапок здымалі і спальвалі пад дубам, выпівалі трошкі гарэлкі, каб сагрэцца і ішлі ў хату, дзе адбывалася пагулянка ў складчыну. Падчас гэтай пагулянкі маглі і ў ката згуляць разам з іншымі гульнямі. Але толькі ў тым разе, калі нехта з жанчын спёк Ката.

Зараз у Новінах, развітваючыся з Калядамі пасля абраду "Цягнуць Каляду на дуба" практыкуюць, калі не паспяваюць спячы тулава і галаву Ката, рабіць яго выяву з батона, у які устаўляюць вушы і ножкі з сала (са скарынкай), а хвост — з печанай "пальцам піханай" каўбасы. Але ў гэтым выпадку Кот атрымліваецца адкормленым, тлустым — у яго галава злілася з тулавам. Магчымы і такі варыянт, але само выпяканне сваімі рукамі печыва азначае ахвяраванне духу-ахоўніку Любу, таму ўсё ж пажадана пячы самім пірог у выглядзе ката, а не карыстацца магазіннай выпечкай. І абавязкова дзяліць і з'ядаць яго разам з усімі ўдзельнікамі гульні.

У Інтэрнеце сустракаецца відэазапіс, дзе сучасная гарадская моладзь замяніла пірог у выглядзе Ката абаранкамі, што поўнасцю перакрэслівае ўвесь сэнс гульні, якая з'яўляецца абрадавай. Пірог выпякаецца менавіта для Люба ў выглядзе Ката, каб Люб як дух-ахоўнік дапамог знайсці кожнаму ўдзельніку ігрышча пару, забяспечыць любоў і шчасце ў сямейным жыцці. Пра Люба людзі не ведаюць, імя гэтае згубілася ў гісторыі. Ва ўсякім разе, ні ў экспедыцыях, ні ў публікацыях Шэйна і яго інфарматараў з розных рэгіёнаў Міншчыны імя Люба не сустракаецца. Проста традыцыя пячы Ката захоўвалася і перадавалася з пакалення ў пакаленне.

У 2014 годзе стала вядома, што ў аграгарадку Бакшты Іўеўскага раёна таксама на Каляды спраўляюць ігрышча “Гуляць Ката”. У экспедыцыю туды ездзіла ў тым годзе беларускі этнамузыколаг з Піцера Галіна Таўлай.

**Гульня “Ката пячы” ў аг. Скірмантава**

Пра ігрышча ў Скірмантава расказала ў 2014 годзе на семінары ў Мінскім абласным метадычным цэнтры дырэктар мясцовага дома культуры і адна з захавальніц гэтай абрадавай гульні Рэдзько Наталля Пятроўна. 27 лістапада гэтага ж года звычай быў адлюстраваны ў фотарэпартажы Аляксея Сталярова для ІНТЭРФАКС, каментарый Рэгіны Гамзовіч.

Аказалася, што, у адрозненне ад іншых вёсак, традыцыя тут жывая, яе захоўваюць самадзейныя калектывы Скірмантава ў сваім асяродку. А традыцыю ім перадала Соф’я Адольфаўна Рэдзько 1932 года нараджэння, якая сюды пераехала з вёскі Грынкевічы (4км ад Скірмантава). Гулялі яе бацькі і ўся радня. І ў навакольных вёсках гэтую гульню таксама спраўлялі. У памяць пра Соф’ю Адольфаўну, якая на ігрышча 27 лістапада збірала ў сваёй хаце ўдзельнікаў створаных ёю калектываў “Сваякі”(1987) і “Весялуха” (1982), ката пякуць дагэтуль у яе хаце, як і раней. Ігрышча ўключае выпяканне пірага ў выглядзе ката, традыцыйныя танцы, песні, жарты, прыпеўкі і гульні эратычнага характару. Збіраецца чалавек 15. Адметна тое, што такая пагулянка ладзілася ў навакольных вёсках маладымі шлюбнымі парамі і нежанатымі парамі моладзі, у ёй маглі ўдзельнічаць і людзі старэйшага ўзросту. Вынас і дзяленне Ката суправаджаюцца, як і на вяселлі пры дзяленні каравая, прыгаворамі ў рыфму. Зімовая пара — час попрадак, калі хлопцы прыглядаюць сабе нявест. Такая гульня была скіравана на тое, каб склаліся шлюбныя пары , у якіх бы маладыя любіліся і пражылі свой век разам дружна, нарадзілі дзяцей, прадоўжыўшы род.